КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

# Дэкларацыя ў падтрымку нацыянальнай ідэнтычнасці і суб’ектнасці беларускай культуры

Прысвечаная пяцігоддзю мірных пратэстаў 2020 года
Канферэнцыя «Новая Беларусь» — жнівень 2025

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сіл Беларусі,

- грунтуючыся на Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце (1990), Акце аб незалежнасці (1991), Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994),
- з улікам міжнародных нормаў па правах чалавека і правах народаў на самавызначэнне,
- беручы пад увагу, што Беларусь прызнана незалежнай усімі краінамі свету,
- улічваючы пагаршэнне становішча беларускай мовы, культуры і грамадзянскай супольнасці пад аўтарытарным ціскам цягам апошніх пяці год,
- канстатуючы інфармацыйную і палітычную экспансію Расіі, якая падрывае нацыянальную суб'ектнасць Беларусі,

***Заяўляем:***

- Беларусь з'яўляецца самастойнай нацыяй з унікальнымі і адметнымі мовай, гісторыяй, культурай, а таксама прававым статусам незалежнай дзяржавы.
- Сістэмныя рэпрэсіі, забарона незалежных медыя, усеагульнае дзяржаўнае падпарадкаванне адукацыі, выцісканне беларускай мовы і пераслед грамадзян і грамадзянак за праявы беларускай ідэнтычнасці — з'яўляюцца пагрозай існаванню нацыі.
- Расійская інфармацыйная агрэсія і палітычнае ўмяшальніцтва вядуць да асіміляцыі беларусаў і беларусак і разбурэння нацыянальнай свядомасці.
- Беларуская дыяспара і беларусы і беларускі ўнутры краіны аказваюцца пад пагрозай страты мовы і культурнай ідэнтыфікацыі з Радзімай з-за рэпрэсіўнай палітыкі ўладаў у дачыненні да беларускай мовы і культуры, а таксама прызнання дэмакратычных інфармацыйных рэсурсаў, праектаў і ініцыятываў экстрэмісцкімі.
- Беларусы — свабодная нацыя і застаюцца вольнымі нават за кратамі, бо ідэнтычнасць — гэта выбар, а не дазвол. Беларуская нацыянальная ідэя, заснаваная на гармоніі, узаемапавазе і дэмакратычных каштоўнасцях, мацнейшая за гвалт і ідэалогію запалохвання.
- Інфармацыйная ізаляцыя беларусаў і беларусак, гвалт і масавыя рэпрэсіі супраць грамадзян і грамадзянак умацоўваюць рэжым дыктатуры, які не дае народу прымаць ніякіх рашэнняў, і лёс цэлай нацыі канцэнтруецца ў руках злачынцаў і захопнікаў і захопніц улады.
- Сілавы курс рэжыму супярэчыць агульначалавечым і дэмакратычным каштоўнасцям, на якія беларусы і беларускі абапіраюцца ў паўсядзённым жыцці: празе да свабоды і незалежнасці, міралюбнасці і годнасці, узаемадапамозе і духу супольнасці, справядлівасці.

- Беларуская ідэнтычнасць трымаецца на глыбокім маральным кодзе, які фарміруе аснову нашага грамадства праз адкрытасць і спагадлівасць, шчырасць і павагу да іншых, памяркоўнасць, цярплівасць як праяву ўнутранай сілы, гатоўнасць дапамагаць нават у цяжкіх умовах.
- Беларуская мова — аснова нацыянальнай свядомасці і ключ да захавання ідэнтычнасці. Гэта мова свабоды, дэмакратыі і супраціву аўтарытарызму, мова, якую мы захоўваем з XVI стагоддзя і якая працягвае жыць, нягледзячы на дзесяцігоддзі рэпрэсій, зневажання і асіміляцыйнага ціску.

***Адзначаем у якасці асноўных прынцыпаў суб’ектнасці беларускай культуры:***

- Мы падтрымліваем вольнае выкарыстанне беларускай мовы у любых формах і заклікаем ствараць для яе прастору: у сям’і, адукацыі, бізнесе, мастацтве, а таксама грамадскім жыцці.
- Мы вітаем любы крок да беларускасці, нават спробу, бо мова — гэта не пра правільнасць, а пра прыналежнасць. І кожны, хто імкнецца гаварыць па-беларуску, — ужо носьбіт гэтай прыналежнасці.
- У сучасных умовах менавіта культура — асноўны складнік нацыянальнай бяспекі. Культура дапамагае захоўваць і будаваць моцную нацыянальную ідэнтычнаць, з якой пeратрывае любая нацыя ў любых абставінах. І менавіта культура захоўвае, перадае і ўмацоўвае гэтую ідэнтычнасць — праз мову, сэнсы, вобраз мыслення, праз памяць і маральную арыентацыю.
- На сёння *праца на карысць культуры і нацыянальнай ідэнтычнасці — гэта галоўны інструмент супрацьстаяння рэжыму.*
- Нацыя — гэта супольнасць агульнай памяці. Мы з павагай ставімся да кожнага перыяду гісторыі Беларусі, якой давялося прайсці праз нямала выпрабаванняў. Ад Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і БНР — да антысавецкага і антыімперскага супраціву, традыцый уніяцтва, шматкультурнасці і мірнага суіснавання з суседнімі еўрапейскімі народамі.
- Мы не прымем аніводнага рэжыму, які спрабуе “задушыць” беларусаў, падмяць пад сябе, знішчыць нашую мову, культуру і памяць.

***Заклікаем:***

Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі, дэкларуем сваю прыхільнасць да беларускай мовы, культуры, гісторыі і еўрапейскага шляху. Мы заклікаем міжнародную супольнасць прызнаваць і падтрымліваць беларускую ідэнтычнасць як частку агульнаеўрапейскай спадчыны. Таксама мы заклікаем як саміх беларусаў і беларусак, так і ўсіх, хто бачыць Беларусь часткай цывілізаванага свету, прыкласці высілкі для таго, каб:

- падтрымліваць культурную дыпламатыю для стварэння прасторы міжкультурнага дыялогу і прыняцця Беларусі ў глабальную сям’ю народаў;
- дапамагаць стварэнню і пашырэнню магчымасцяў для адукацыі на беларускай мове, узрастанню грамадскага попыту на беларускамоўнае навучанне;
- садзейнічаць прасоўванню беларускай культуры — як унутры краіны, так і за яе межамі — як каштоўнай часткі глабальнай культурнай спадчыны і асновы ідэнтычнасці беларускага народа, як аднаго з старажытных народаў Еўропы;
- падтрымліваць асяродкі і цэнтры беларускай дыяспары, народныя амбасады, як тых, што рэпрэзентуюць дэмакратычныя каштоўнасці і еўрапейскі выбар беларускага народа ва ўмовах акупацыі і рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці і нацыянальнай культуры;
- наладжваць знаёмства з беларускай літаратурай, яе аўтарамі, садзейнічаць перакладам з і на беларускую мову як крыніцы ўзаемнага разумення і прызнання нацыянальнай адметнасці;
- падтрымліваць пераклады твораў масавай культуры на беларускую мову для яе папулярызацыі і пашырэння сферы выкарыстання;
- павялічваць уцягнутасць беларускіх арганізацый і супольнасцяў у працу з еўрапейскімі інстытуцыямі, спрыяць мабілізацыі рэсурсаў для развіцця беларускай культуры як асновы ідэнтычнасці.

*Дэкларацыя прынята*

*Варшава, жнівень 2025 г.*